Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма
Цэнтральная раённая бібліятэка
Аддзел абслугоўвання і інфармацыі

**Серыя «Адукацыя на Кобрыншчыне»**

# ПЕРШАЯ «ШКОЛА МІРУ» НА БРЭСТЧЫНЕ

***Да 110-годдзя з часу першага згадвання аб школе ў в. Астромічы Кобрынскага раёна***
***(дзяржаўная ўстанова адукацыі «Астроміцкая сярэдняя школа»)***

**Інфармацыйна-бібліяграфічнае выданне**

Кобрын
2022

УДК 016:37.018(476.7)
ББК 91.9:74(4Беи)
П67

Серыя заснавана ў 2020 годзе

***Складальнік***
галоўны бібліёграф аддзела абслугоўвання і інфармацыі
цэнтральнай раённай бібліятэкі *С. Д. Курачук*

П67 **Першая «Школа міру» на Брэстчыне** : інфармацыйна-бібліяграфічнае выданне да 110-годдзя з часу першага згадвання аб школе ў в. Астромічы (установа адукацыі «Астроміцкая сярэдняя школа») / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: галоўны бібліёграф С. Д. Курачук. - Кобрын, 2022. – 48 с. – (Серыя «Адукацыя на Кобрыншчыне»).

Інфармацыйна-бібліяграфічнае выданне «Першая “Школа міру” на Брэстчыне» з серыі «Адукацыя на Кобрыншчыне» дае магчымасць пазнаёміцца з гісторыяй заснавання і сённяшнім днём Астроміцкай сярэдняй школы – школы, якая першай на Брэстчыне атрымала ганаровы статус «Школа міру».

**УДК 016:37.018(476.7)**
**ББК 91.9:74(4Беи)**

© Кобрынская раённая цэнтралізаваная
бібліятэчная сістэма, 2022

# АД СКЛАДАЛЬНІКА

Так ужо вядзецца з даўніх часоў, што школа ў жыцці чалавека адыгрывае вялікую ролю. Менавіта са школы пачынаецца жыццёвы шлях чалавека. Школа дае веды, фарміруе характар, закаляе, рыхтуе да працы.

2022 год - знакавая падзея ў жыцці настаўнікаў і навучэнцаў дзяржаўнай установы адукацыі «Астроміцкая сярэдняя школа». 110 гадоў мінула з таго часу, як распачаўся ў гэтым куточку адукацыйны працэс.

Багатая гісторыя, выдатныя традыцыі, прафесіянальны калектыў і сучасная матэрыяльная база – менавіта такой школа сустракае свой юбілей.

Інфармацыйна-бібліяграфічнае выданне «Першая “Школа міру” на Брэстчыне» працягвае цыкл выданняў з серыі «Адукацыя на Кобрыншчыне» і дае магчымасць пазнаёміцца з гісторыяй заснавання і сённяшнім днём Астроміцкай сярэдняй школы - школы, якая першай на Брэстчыне атрымала ганаровы статус «Школа міру».

Паказальнік мае наступную структуру:

*Ад складальніка*

*I. Да вытокаў*

*II. У творчым саюзе: сучасны дзень школы*

*III. Школа міру – школа дабра*

*IV. У спадчыну – памяць: гісторыка-краязнаўчы музей школы*

*V. Школьны двор як крыніца натхнення*

*Спіс крыніц*

*Спіс перыядычных выданняў, матэрыялы з якіх уключаны ў паказальнік*.

Выданне прадстаўляе каля 100 бібліяграфічных крыніц. Уключае артыкулы з перыядычных выданняў, пачынаючы з 1985 года. Артыкулы размешчаны па гадах у зваротнай храналогіі, унутры года – у алфавіце аўтараў, загалоўкаў. Для раскрыцця зместу пры неабходнасці да запісаў даюцца кароткія даведачныя анатацыі.

Даведачны апарат прадстаўлены алфавітным спісам перыядычных выданняў, матэрыялы з якіх уключаны ў паказальнік.

Выданне змяшчае фотаздымкі розных гадоў з віртуальнага музея на сайце ўстановы адукацыі «Астроміцкая сярэдняя школа» (https://kobrinostrom.znaj.by).

Паказальнік адрасаваны ўсім, хто займаецца вывучэннем роднага краю, цікавіцца яго гісторыяй, адукацыяй, культурай.

*Выказваем падзяку за дапамогу ў падрыхтоўцы выдання настаўніку гісторыі ўстановы адукацыі «Астроміцкая сярэдняя школа», кіраўніку школьнага гісторыка-краязнаўчага музея «Спадчына» Таццяне Аляксееўне Тунчык.*

# ДА ВЫТОКАЎ

Першае згадванне пра школу ў вёсцы Астромічы адносіцца да 1912 года. Школа размяшчалася ў хаце Антона Еўдасюка. Да гэтага часу на ўсё наваколле існавала толькі адна школа, якая знаходзілася ў вёсцы Яромічы.



Да 1939 года выкладанне ўсіх прадметаў у школе вялося на польскай мове.

Пасля ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР у вёсцы быў пабудаваны новы будынак школы, дзе вучыліся дзеці з найбліжэйшых вёсак.



Падчас Вялікай Айчыннай вайны будынак школы быў спалены.

Пасля заканчэння вайны вёска паступова адраджалася, наладжвалася мірнае жыццё.

У 1946 годзе адкрылася пачатковая школа, якая размяшчалася ў прыватнай хаце і складалася з двух класных пакояў і настаўніцкай. Першымі настаўнікамі школы былі Сцепаніда Сцяпанаўна Шокун і Данііл Іосіфавіч Барысюк.







З верасня 1965 года дырэктарам школы стаў Сямён Данілавіч Барысюк, які на гэтай пасадзе працаваў да 1973 года.

У 1973 годзе пад памяшканне школы быў аддадзены новы будынак, і з гэтага часу школа атрымлівае статус васьмігадовай. Дырэктарам прызначаны Уладзімір Пятровіч Авіцюк (1973-1987).



У лістападзе 1984 года пачалося будаўніцтва новай сярэдняй школы. 30 жніўня 1985 года школа расчыніла свае дзверы перад 306 вучнямі. Такую школу, светлую, прасторную, вялікую, з надзеяй і радасцю чакалі і настаўнікі, і вучні, і іх бацькі.

Самая вялікая колькасць вучняў прыйшлася на сярэдзіну 90-х гадоў XX стагоддзя.



*Дырэктар школы С. П. Лаўрысюк (1988-1999)*

# У ТВОРЧЫМ САЮЗЕ
## *сучасны дзень школы*





Школа - адзін з найважнейшых сацыяльных аб'ектаў аграгарадка Астромічы. Размешчана ўстанова па адрасе: вуліца Школьная, 2 А, аграгарадок Астромічы Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці.

Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Астроміцкая сярэдняя школа» аказвае адукацыйныя паслугі ў адпаведнасці з адзіным тыпавым вучэбным планам. На III ступені арганізавана мульціпрофільнае навучанне.



З 1 верасня 2018 года ў школе ажыццяўляецца прафесійная падрыхтоўка навучэнцаў 10, 11 класаў па I мадэлі. З 1 верасня 2021 года адкрыта аграрная група ў 10 класе.

Сёння тут атрымліваюць адукацыю 224 навучэнцаў у 13 класах-камплектах: 1-4 класы - 84 чалавекі, 5-9 класы - 111 чалавек, 10-11 класы - 29 чалавек. Мова навучання - беларуская. Замежная мова - англійская, нямецкая. Урокі ў школе праходзяць у адну змену.

У школе арганізаваны факультатыўныя заняткі па вучэбных прадметах і іншых напрамках. Навучэнцы школы могуць атрымаць дадатковую адукацыю па эстэтычным, дэкаратыўна-прыкладным, спартыўным і іншых накірунках. Развіта сетка дадатковых адукацыйных паслуг на аснове пазабюджэтнай дзейнасці: падрыхтоўка дзяцей 5-гадовага ўзросту да школы, заняткі па розных навучальных прадметах. Працуе пункт карэкцыйна-педагагічнай дапамогі.

У распараджэнні навучэнцаў:
15 вучэбных кабінетаў;






бібліятэка;
кабінет сацыяльна-псіхалагічнай службы;
вытворчыя майстэрні;
спартыўная зала;
трэнажорная зала.





У школе жыццё сапраўды кіпіць. Разнастайныя напрамкі дзейнасці і атрыманыя вынікі сведчаць аб творчай працы калектыву. Асновай школы, безумоўна, з'яўляецца настаўніцкі калектыў, вельмі вопытны і кампетэнтны, які ўжо шмат гадоў зладжана і аднадушна працуе. У школе 33 педагогі, з іх вышэйшую катэгорыю маюць 15, першую катэгорыю – 11, другую катэгорыю – 4, без катэгорыі - 3 педагогі.



Дырэктар Галіна Уладзіміраўна Свянцецкая з энтузіязмам і адказнасцю імкнецца падтрымаць набытае, выпрацаванае гадамі, і ўнесці нешта новае, што паспрыяла б паляпшэнню адукацыйнага працэсу.



У раённых аглядах-конкурсах на лепшую ўстанову адукацыі Астроміцкая школа неаднаразова была лепшай сярод сельскіх сярэдніх школ.

Работа па захаванні фізічнага і псіхалагічнага здароўя вучняў — адзін з асноўных напрамкаў дзейнасці школы. Педагогі выхоўваюць у дзяцей унутраную патрэбу ў здаровым ладзе жыцця. Вялікая ўвага ўдзяляецца медыцынскаму кантролю за станам дзіцячага здароўя. Важную ролю ў захаванні і ўмацаванні здароўя школьнікаў адыгрываюць правільная арганізацыя вучэбнага працэсу і размеркаванне вучэбнай нагрузкі. Дзякуючы факультатыўным заняткам «Гадзіна здароўя», фізкультхвілінкам і рухавым перапынкам, істотна павялічылася рухальная актыўнасць дзяцей, знізілася іх стамляльнасць на ўроках. Пытанням здароўя прысвячаюцца ўрокі па асновах бяспекі жыццядзейнасці, хіміі і біялогіі. Для прафілактыкі зрокавай стомленасці ў кожным класе ўсталяваны афтальматрэнажоры. На высокім узроўні наладжана спартыўна-аздараўленчая работа. Дзеці актыўна ўдзельнічаюць у традыцыйным марафоне здароўя.

Важнае месца ў адукацыйным працэсе займае працоўная дзейнасць. Вучні прыбіраюць школьную тэрыторыю, працуюць на прышкольным участку.

Павелічэнне памеру вытворчага аддзела вучэбна-доследнага ўчастка дазваляе забяспечыць школу на ўвесь год агароднінай. Сельскагаспадарчая прадукцыя, вырашчаная ў экалагічна чыстых умовах, дапамагае арганізаваць здаровае і збалансаванае харчаванне. Такая мэтанакіраваная сістэмная работа нераўнадушных педагогаў дапамагае захаваць фізічнае і псіхалагічнае здароўе вучняў.

Для настаўніка самае галоўнае - шчасце і поспехі яго вучняў. Высокі ўзровень падрыхтоўкі навучэнцаў забяспечваецца пастаяннай працай педагагічнага калектыву ў пошуках найбольш аптымальных умоў для іх паспяховага навучання і выхавання. Вынікам такой працы з'яўляюцца перамогі вучняў школы на розных раённых і абласных конкурсах, у рэспубліканскай алімпіядзе па вучэбных прадметах, на навукова-практычных канферэнцыях, іншых інтэлектуальных конкурсах.

У 2019/2020 навучальным годзе за ўдзел у алімпіядах Астроміцкая школа атрымала 13 дыпломаў, 2 пахвальных водзываў.

У 2021 годзе два выпускнікі Астроміцкай школы атрымалі атэстаты аб агульнай сярэдняй адукацыі асобага ўзору з узнагароджаннем залатым медалём.

У школе пануе добразычлівая атмасфера, напоўненая любоўю да дзяцей. Установа ганарыцца сваімі выпускнікамі, якія сталі годнымі грамадзянамі і дасягнулі пэўных жыццёвых вышынь. А выпускнікі з задавальненнем наведваюць родную школу ў будні і святы.

# ШКОЛА МІРУ - ШКОЛА ДАБРА




У верасні 2019 года дзяржаўная ўстанова адукацыі «Астроміцкая сярэдняя школа» атрымала статус «Школа міру», стала часткай унікальнага праекта Арганізацыі Аб’яднаных Нацый «Сетка школ міру».

Астроміцкая школа з’явілася першай установай адукацыі на Брэстчыне, якая атрымала такі ганаровы статус.

З нагоды яго атрымання адбылося святочнае мерапрыемства з удзелам прадстаўнікоў улады, Беларускага фонду міру і інш. Ва ўрачыстай абстаноўцы 20 юнакоў і дзяўчат былі прыняты ў рады міратворцаў. Школьнікі пакляліся быць адказнымі за захаванне і ўмацаванне міру і бяспекі на планеце.

Праект па стварэнні сеткі «Школ міру» - адна з інавацыйных форм пазакласнай работы па грамадзянска-патрыятычным і экалагічным выхаванні моладзі ў духу гуманізму, прагрэсу, справядлівасці, узаемаразумення і дружбы народаў, усеагульнай павагі чалавечых правоў і свабод. Ідэя стварэння такой сеткі належыць грамадскаму аб’яднанню «Беларускі фонд міру» пры падтрымцы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, а галоўная мэта - умацаванне міру праз выхаванне і адукацыю дзяцей.

«Школы міру» ўжо дзейнічаюць у розных установах адукацыі нашай краіны. Да іх далучылася і Астроміцкая сярэдняя школа.



Да падобнага звання школа прыйшла не адразу. Гэта гады працы не аднаго пакалення педагогаў, якія выхоўваюць у сваіх вучнях уважлівасць, дабрыню,

тактоўнасць, справядлівасць, гуманізм. У школе шмат увагі надаецца грамадзянска-патрыятычнаму выхаванню: вучні разам з педагогамі дапамагаюць ветэранам, удзельнічаюць у добраўпарадкаванні, рэканструкцыі помнікаў і воінскіх пахаванняў часоў Вялікай Айчыннай вайны, вядуць пошукавую працу, захапляюцца краязнаўствам, прапагандуюць здаровы лад жыцця, чым і апраўдалі прысваенне такога высокага статусу.




Адным з галоўных крытэрыяў быў удзел у разнастайных рэспубліканскіх конкурсах і праектах. Вучні Астроміцкай школы пастаянна радуюць сваіх настаўнікаў перамогамі ў гэтых праектах. Конкурсы розныя - ад стварэння відэаролікаў, напрыклад, пра вырошчванне герані, да больш маштабных, як грамадзянска-патрыятычны праект «Збяры Беларусь у сваім сэрцы», дзе заданнем было падрыхтаваць творчую работу пра жыццё знакамітага земляка.

Навучэнцы школы заваявалі дыплом II ступені рэспубліканскага ўзроўню за ўдзел у конкурсе даследчых работ «Малая Радзіма вялікіх людзей» у рамках акцыі «Я гэты край Радзімаю заву»; атрымалі дыплом II ступені ў конкурсе на лепшы турыстычны паход «Пазнай Радзіму – выхавай сябе». Некалькі гадоў запар школа перамагае ў абласным аглядзе-конкурсе «Цудоўней стане Брэстчына мая», з’яўляецца пераможцам раённага агляду-конкурсу на лепшую ўстанову адукацыі па выніках працы (2016 год).

Навучальная ўстанова ўдастоена дыплома I ступені

за ўдзел у раённым этапе рэспубліканскага конкурсу літаратурных работ «Великая Победа: наследие и наследники», таксама прыняла ўдзел у рэспубліканскім фестывалі-конкурсе творчасці дзяцей і моладзі «Вянок Славы», якія былі прысвечаны 75-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. За ўдзел у выставе-конкурсе дзіцячай творчасці «Салют Перамогі-75» навучэнцы школы атрымалі дыплом II ступені.

Музейна-адукацыйны праект «Погляд скрозь час» школы заваяваў дыплом I ступені на раённым узроўні ў рэспубліканскай героіка-патрыятычнай акцыі «Вялікай Перамозе -75».

На рахунку педагогаў і вучняў шмат цікавых грамадска-карысных спраў. Так, навучэнцы школы пастаянна займаюцца добраўпарадкаваннем помнікаў, размешчаных у мікрараёне школы.





З атрыманнем ганаровага статусу работа па патрыятычным выхаванні ў школе пашырылася. У рамках акцыі «Во славу общей Победы» прайшло ўрачыстае мерапрыемства па заборы зямлі з брацкай магілы ў Астромічах для далейшай яе перадачы ў храм-помнік усіх Святых у Мінску.



*Вучні Астроміцкай СШ на ўрачыстым мітынгу каля брацкай магілы*

Арт-інсталяцыя на тэрыторыі школы, прысвечаная 75-годдзю Перамогі, нагадвае пра тых, каму мы ўдзячныя за мірнае неба над галавой.

*Арт-інсталяцыя «Вайна. Перамога. Памяць»*



У 2019 годзе пад эгідай міжнароднай грамадскай арганізацыі «Дапамажы людзям» пачалася рэалізацыя гуманітарнага праекта. Гэта сельскагаспадарчы праект, асноўная ідэя якога заключалася ў тым, каб дзеці з дапамогай настаўнікаў займаліся вырошчваннем бульбы і іншай гародніны на школьным участку. Дзякуючы замежным партнёрам, якія прапанавалі школе насенне элітных гатункаў агародніны, школьнікі заняліся яе вырошчваннем з мэтай апрабацыі перадавых агратэхналогій і ўмацавання матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстановы.

Удзел школы ў праекце міжнароднай грамадскай арганізацыі «Дапамажы людзям» у чарговы раз даказаў, што праца мае важную ролю ў працэсе выхавання. Школа валодае гектарам уласнай зямлі, таму ёсць дзе разгарнуцца. Замежныя госці прыязджалі некалькі разоў: назіралі за пасадкай, праполкай і зборам ураджаю. Дарэчы, гародніна пайшла ў сталовую, лішкі - на продаж.

У снежні 2021 года прайшоў конкурс на лепшы праект «Малая радзіма і яе развіццё вачыма моладзі». Навучэнка 11 класа Ганна Зіневіч пад кіраўніцтвам настаўніцы гісторыі Т. А. Тунчык



прадставіла на конкурс праект свайго бачання перспектыў развіцця аграгарадка Астромічы. Праект стаў пераможцам!

Школа з’яўляецца дыпламантам І ступені абласнога агляду-конкурсу па навядзенні парадку і азеляненні школьных тэрыторый.

Дзяржаўная ўстанова адукацыя «Астроміцкая сярэдняя школа» ідзе ў нагу з часам, адпавядае сучасным запатрабаванням як у вучэбнай, так і ў выхаваўчай дзейнасці.






***Направления реализации проекта:***

**1. Народная дипломатия**

Девиз: «В дружбе народов – единство мира».

**2. Память**

Девиз: «Беларусь помнит …».

**3. Забота и милосердие**

Девиз: «Чудо под названием человечность».

**4. Мир через спорт и культуру**

Девиз: «Мир, культура и спорт неразделимы».

**5. Юный миротворец**

Девиз: «Через добрые дела – к миру и взаимопониманию».

# У СПАДЧЫНУ - ПАМЯЦЬ
## *гісторыка-краязнаўчы музей школы*

Сапраўдным цэнтрам краязнаўства і патрыятызму з’яўляецца школьны гісторыка-краязнаўчы музей «Спадчына», актыў якога з'яўляецца пастаянным удзельнікам раённага парада музеяў устаноў адукацыі.

Музей у Астроміцкай сярэдняй школе быў створаны ў 1994 годзе (*загад дырэктара школы № 8 ад 10 верасня*). На першым паверсе школы пад музей было адведзена асобнае памяшканне.



Заснавальнікам і першым кіраўніком школьнага музея быў настаўнік гісторыі Анатолій Міхайлавіч Навумчык. Пад яго кіраўніцтвам вялося мэтанакіраванае вывучэнне гісторыі вёскі. Першымі экспанатамі сталі прадметы сялянскага побыту і фрагменты зброі часоў Вялікай Айчыннай вайны.



З'явіліся і першыя альбомы, якія змяшчаюць фатаграфіі-арыгіналы. Сёння гэта найкаштоўнейшы матэрыял.

З 2001 па 2004 год працай музея кіраваў выпускнік школы, настаўнік гісторыі Уладзімір Мікалаевіч Абрамчук, з

2005-га па 2006 год – настаўнік беларускай мовы і літаратуры Рыта Міхайлаўна Канапацкая.

Актывізавала работу, напоўніла яе новым зместам настаўнік гісторыі Таццяна Аляксееўна Тунчык, якая з 2006 года па сённяшні час з’яўляецца кіраўніком музея. Ёй дапамагаюць іншыя настаўнікі, а школьнікі з задавальненнем праводзяць у музеі шмат часу.



Сёння школьны музей - гэта адна з формаў дадатковай адукацыі. Дзейнасць па фарміраванні каштоўнасных адносін навучэнцаў да гістарычнага мінулага малой радзімы, сваіх продкаў, культурнай спадчыны роднага краю ператварае музей у сапраўдны цэнтр грамадзянска-патрыятычнага выхавання навучэнцаў.

Экспанаты і архівы музея актыўна выкарыстоўваюцца і ў адукацыйным працэсе для правядзення ўрокаў па гісторыі Беларусі, урокаў беларускай літаратуры, мастацтва, а таксама для даследчай і творчай дзейнасці вучняў.




Сабраныя за гады стварэння школьнага музея прадметы склалі музейны фонд, які сёння прадстаўлены 144 прадметамі асноўнага фонду і 70 навукова-дапаможнага.

Калекцыя складаецца з археалагічных, палеанталагічных, этнаграфічных, нумізматычных прадметаў.

Сабрана больш за 200 экспанатаў палеанталагічных знаходак.





У экспазіцыі таксама прадстаўлены экспанаты перыяду Вялікай Айчыннай вайны - гэта фрагменты ўзбраення і прадметы ваеннага побыту. Намаганнямі настаўнікаў і дзяцей аформлены стэнд аб ветэранах з інфармацыяй аб іх узнагародах, запісваюцца ўспаміны сведкаў вайны.






Ёсць цэлая выстаўка артэфактаў вайны: на паліцах – ваенныя каскі, гільзы, вінтоўка Мосіна, фрагменты штык-



нажоў, сумка санінструктара і іншыя экспанаты. Пастаянна вядзецца абнаўленне экспазіцыі, прысвечанай Вялікай Айчыннай вайне, афармляюцца стэнды аб прапаўшых без вестак жыхарах вёскі Астромічы, спаленых вёсках раёна, вязнях канцлагераў.

У выніку распрацоўкі настаўнікамі і навучэнцамі экспазіцыйнага плана ў музеі з'явіліся 4 экспазіцыі.

Этнаграфічная экспазіцыя «*Традыцыі і побыт сялян канца XIX ст. - пачатку XX ст.*», «*Рамёствы і промыслы*» займае ў невялікім школьным музеі цэнтральнае месца і ў шырокім аспекце прадстаўляе асаблівасці беларускага этнасу, побыт аднавяскоўцаў, іх традыцыі, абраднасць і рамёствы.





У экспазіцыя «*Вёсачка мая*» сабраны гісторыка-краязнаўчы матэрыял ад першага згадвання вёскі Астромічы ў XVI стагоддзі да пераўтварэння яе ў аграгарадок.



Экспазіцыя «*Нашы землякі ў гады Вялікай Айчыннай вайны*» прадстаўляе фатаграфіі і дакументы ваенных гадоў, успаміны ветэранаў-землякоў, дзяцей вайны і вязняў, матэрыялы і фатаграфіі пахаванняў, а таксама выставу ваенных экспанатаў - фрагментаў узбраення і ваеннага побыту.




Экспазіцыя «*Гісторыя школы*» дэманструе разнастайную тэматычную падборку фотаматэрыялаў, відэаролікаў, прэзентацый, прысвечаных гісторыі адукацыі, біяграфіям педагогаў-ветэранаў, дасягненням выпускнікоў Астроміцкай школы. Значную дапамогу пры стварэнні гэтай экспазіцыі аказалі педагогі-ветэраны.






Шматлікія музейныя экспанаты не проста знаходзяцца тут, але і працуюць, абуджаючы ў юных вяскоўцах жывую цікавасць да сваёй мінуўшчыны.

У рабоце школьнага гісторыка-краязнаўчага музея дзеці прымаюць самы актыўны ўдзел. Вучні сярэдніх



класаў прыносяць экспанаты, старэйшыя вядуць навукова-даследчую працу.

Вучні школы штогод у ліку пераможцаў конкурсу юных экскурсаводаў вобласці і рэспубліцы.

У 2015 годзе Валерыя Аўсейчук атрымала трэцяе месца на рэспубліканскім конкурсе юных экскурсаводаў «Мая радзіма, Беларусь» у рамках акцыі «Жыву ў Беларусі і тым ганаруся».

У 2014 годзе работа Аляксандра Шасцерыка і Марыі



Свіржэўскай на конкурсе «Сцяжынкамі малой радзімы» заняла другое месца ў рэспубліцы, а таксама ў тым жа годзе юным даследчыкам была ўручана грамата ад Брэсцкага ваенкамата за ўдзел у конкурсе «Вазьмі, мой унук, у спадчыну памяць» за работу «Лёс генерала», якая распавядала пра жыццёвы і ваенны шлях выхадца з Кобрыншчыны генерал-маёра Аляксея Грышкоўскага.

Першымі ў вобласці ў 2013 годзе сталі пераможцы конкурсу юныя экскурсаводы Вольга Блядных і Павел Леўшыц.

І гэта далёка не поўны пералік узнагарод астроміцкіх дзяцей.

У 2020 годзе ў намінацыі «Музейны адукацыйны праект» творчы калектыў педагогаў і навучэнцаў установы адукацыі «Астроміцкая сярэдняя школа» ўзнагароджаны дыпломам ІІ ступені Галоўнага ўпраўлення па адукацыі Брэсцкага аблвыканкама.

У невялічкім пакоі музея ўжо даўно не ўмяшчаюцца ўсе экспанаты. З кожным годам іх становіцца больш, як і дзіцячых узнагарод абласнога і рэспубліканскага ўзроўняў.







Настаўнікі Астроміцкай школы вучаць любіць і шанаваць гісторыю і свой край. Менавіта праз такую работу і выхоўваюцца сапраўдныя патрыёты.

# ШКОЛЬНЫ ДВОР ЯК КРЫНІЦА НАТХНЕННЯ



Атмасферу добразычлівасці, творчай актыўнасці, якія пануюць у школе, дапаўняе маляўнічы пейзаж школьнага двара. Тэрыторыя навучальнай установы вылучаецца арыгінальным і непаўторным знешнім выглядам, цікавымі ландшафтнымі формамі. Тут ёсць і велізарная матылёк-падстаўка для кветак, і сажалка з падсветкай, і імітацыя сельскага падворка, і клумбы з яркімі кветкамі, і казачныя персанажы…

Стваралася ўся гэтая прыгажосць не адзін год. Ініцыятыўная група, у якую ўвайшлі самыя актыўныя настаўнікі школы, стварыла праект, у якім было адлюстравана ўсё, што хацелася ўвасобіць у жыццё. Мэта праекта - выхаваць у дзяцей эстэтычны густ, сфарміраваць пачуццё адказнасці за родную школу, павысіць рэпутацыю ўстановы.

Астроміцкія педагогі лічаць, што дарога да ведаў больш прыемная, калі праходзіць сярод чысціні і прыгажосці, таму ва ўстанове шмат робіцца па добраўпарадкаванні і азеляненні тэрыторыі. Удзельнікі спецыяльнага праекта асвойвалі ролі мастакоў, скульптараў, ландшафтных дызайнераў і кветкаводаў.

Рэалізаваць задуманае ўдалося дзякуючы згуртаванаму калектыву педагогаў і вучняў. Праект пачаўся з апытання вучняў. Педагогі цікавіліся, якім яны хацелі б бачыць школьны двор. Высветлілася, што ў дзяцей шмат ідэй, прычым вучні хацелі не толькі змяніць многае ў афармленні тэрыторыі, але і прыняць у гэтым актыўны ўдзел. Першачарговым жаданнем было абсталяваць месцы адпачынку (альтанку і лаўкі) і працягнуць алею выпускнікоў.

Педагогі С. М. Чалей і С. А. Шыкасюк працавалі над малымі архітэктурнымі формамі. Іх намаганнямі былі створаны габіёны, якія ўрачыста стаяць ля цэнтральнага ўвахода, утульная альтанка, дзе можна адпачыць на перапынку, клумбы-кошыкі і г. д. Генератарамі адметных дызайнерскіх ідэй сталі А. Ю. Салей і Л. С. Крыўчэня. Значны ўклад у афармленне ландшафту ўнеслі Н. В. Штык і Н. В. Варанюк.

Нікога не пакідае абыякавым клумба ў форме матылька, створаная татам аднаго з вучняў школы Уладзімірам Штыком.



*Яркі матылек сустракае хлопчыкаў і дзяўчынак і гасцей школы, падымаючы усім настрой*

Новы выгляд атрымаў і школьны вадаём. Радуе вока відавая разнастайнасць прыбярэжнай расліннасці.



Цікавы аб'ект добраўпарадкавання на тэрыторыі школы - імітацыя сельскага падворка. На вялікім зялёным газоне створаны куток у стылі кантры, дзе размясціліся вазок, калодзеж з калаўротам, старыя кухонныя прылады, будка і фігуркі хатніх жывёл. Побач абгароджанай лазовымі прутамі тэрыторыі - невялікі млын. Ідэя падворка належыць дырэктару школы Галіне Уладзіміраўне.



На тэрыторыі школьнага дворыка шмат кветак і на звычайных арабесках і кветніках. Закладзена садовая алея, ёсць невялікі дэндрарый-пляцоўка, на якой выпускнікі высаджваюць на памяць розныя расліны.

Добраўпарадкаваная тэрыторыя Астроміцкай школы не можа не прыцягнуць увагі. Нездарма яна ўжо стала зонай адпачынку і месцам для прагулак (накшталт міні-парку) для маладых мам з каляскамі, пажылых людзей і іншых жыхароў аграгарадка Астромічы. Сюды прыязджаюць фатаграфавацца маладыя, зазіраюць і людзі, якія проста праязджаюць міма.



Прышкольная тэрыторыя стала цэнтрам актыўнасці вучняў. Штодзень іх сустракае ўтульны і незвычайны школьны дворык, аформлены ўласнымі рукамі.

Прыгажосць, створаная сумеснымі намаганнямі настаўнікаў і вучняў, кожнаму дорыць радасць, дазваляе настроіцца на добры лад, выклікае адчуванне цеплыні і ўтульнасці.

Па-гаспадарску старанна і творча аформленая школьная тэрыторыя неаднаразова прызнавалася ўзорнай у конкурсах рознага ўзроўню. Па добраўпарадкаванні тэрыторыі Астроміцкая школа лідар у вобласці!

.



# Дзяржаўная ўстанова адукацыі «АСТРОМІЦКАЯ СЯРЭДНЯЯ ШКОЛА»




**Якіх бы вышынь не дасягалі ў жыцці, усе мы выйшлі са школы, дзе навучыліся самаму галоўнаму – быць людзьмі, годнымі сваёй Айчыны.**

**Мінае час, і ўсё далей адыходзяць школьныя гады са сваімі шчырымі і чыстымі пачуццямі. Мабыць, таму любы юбілей школы, акрамя радасці сустрэч з былымі настаўнікамі і аднакласнікамі, заўсёды прыносіць крышачку добрага суму і асабліва выразнае адчуванне няўмольнага бегу часу…**

# СПІС КРЫНІЦ

**Дзяржаўнай установе адукацыі «Астроміцкая сярэдняя школа» (1912) – 110 гадоў** // Зводны каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2021-2025 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2020. – С. 66.

**Бакун, А**. Беларусамі звацца / Алена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2022. — 16 лютага (№ 12). — С. 1, 4 : фат.

Пра настаўніцу беларускай мовы і літаратуры Астроміцкай сярэдняй школы Кобрынскага раёна Рыту Канапацкую.

**Бакун, Е.** Посеешь знания — пожнешь признание / Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2021. - 1 верасня (№ 69). - С. 1, 4 : фот.

По итогам работы за 2020 год учитель белорусского языка и литературы Остромичской средней школы Р. М. Конопацкая занесена на Доску почета Кобринского района.

**Бакун, Е.** С наградами — к покорению новых вершин / Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2022. - 12 студзеня (№ 2). — С. 5 : фот.

Учащиеся Остромичской школы – в числе победителей II этапа республиканской олимпиады по учебным предметам.

**Белов, Д.** Выходят в жизнь выпускники / Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2021. — 16 чэрвеня (№ 47). — С. 5 : фот.

В Остромичской средней школе прошел выпускной вечер.

**Пашкович, Л.** Аммониты под ногами, или Время собирать камни / Людмила Пашкович // Кобрынскі веснік. - 2021. — 27 лютага (№ 17). — С. 10 : фот.

В Остромичской средней школе Кобринского района собрано более 200 экспонатов палеонтологических находок.

**Пашкович, Л. В.** Аммониты под ногами / Л. В. Пашкович // Заря. - 2021. - 24 февраля (№ 15). - С. 13 : фот.

В Остромичской средней школе Кобринского района собрана большая палеонтологическая экспозиция.

**Елизарова, Ж**. Новые победы кобринских школьников / Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. – 2020. – 5 лютага (№ 9). – С. 5.

В числе лидеров республиканского конкурса «Мясціны майго дзяцінства» - учащиеся ГУО «Остромичская средняя школа» А. Зинович, А. Меняйло, П. Шепетюк (руководитель Т. Тунчик).

**Елизарова, Ж.** Школьные музеи – хранители истории / Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. – 2020. – 27 мая (№ 40). – С. 8 : фот.

В номинации «Музейный образовательный проект» дипломом II степени главного управления по образованию Брестского облисполкома награждён творческий коллектив педагогов и учащихся Остромичской средней школы.

**Игнатюк, В. А.** Их подвиг мы в сердце храним! / В. А. Игнатюк // Кобрин-информ. – 2020. – 16 апреля (№ 16). — С. 20 : фот.

В номинации «Музейно-образовательный проект» районного этапа республиканского конкурса «Их подвиг мы в сердце храним» дипломом I степени награждена Остромичская СШ.

**Петрукович, Т.** Виват, победители! / Татьяна Петрукович // Кобрин-информ. – 2020. – 30 января (№ 05). – С. 2.

В числе победителей республиканской олимпиады по учебным предметам учащиеся Остромичской СШ.

**Бакун, А.** Перамога ўсміхаецца лепшым / Алена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2019. — 23 студзеня. — С. 3.

Паспяхова выступілі вучні Астроміцкай СШ на абласным этапе рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах.

**Грышкевіч, С.** Першая «Школа міру» на Брэстчыне / Сяргей Грышкевіч // Настаўніцкая газета. - 2019. — 6 кастрычніка. — С. 4 : фот.

Астроміцкая сярэдняя школа Кобрынскага раёна атрымала ганаровы статус «Школа міру».

**Елізарава, Ж.** З любоўю да роднага краю / Жанна Елізарава // Кобрынскі веснік. - 2019. — 8 чэрвеня. — С. 12.

Вучаніца Астроміцкай СШ В. Бура стала пераможцам конкурсу юных чытальнікаў сярод вучняў 7-8 класаў.

**Елизарова, Ж.** Школа мира — школа добра / Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. - 2019. - 5 кастрычніка. - С.1.

Остромичской средней школе присвоен почетный статус «Школа мира».

**Муха, Ф. «**Школа мира» в Остромичах / Федор Муха // Заря. - 2019. — 2 октября. — С. 19 : фот.

Первой на Брестчине Остромичская средняя школа получила почетный статус **«**Школа мира».

**Определены** победители районного смотра-конкурса на лучшее учреждение образования // Кобрынскі веснік. - 2019. – 23 лютага. – С. 4.

Среди сельских средних школ первое место завоевало ГУО «Остромичская средняя школа».

**Пашкович, Л. «**Букет добра» / Людмила Пашкович // Кобрынскі веснік. - 2019. — 25 верасня. — С. 5 : фот.

Учащиеся Остромичской средней школы приняли участие в акции Международного благотворительного фонда помощи детям.

**Пашкович, Л.** Новогодний подарок ... трактор / Людмила Пашкович // Кобрынскі веснік. - 2019. — 31 снежня (№ 101). — С. 4 : фот.

Остромичская средняя школа получила в подарок от подшефной организации НПС «Кобрин» ОАО «Гомельтранснефть «Дружба» трактор «Беларус-211».

**Пашковіч, Л**. «Школа міру» гучыць годна / Людміла Пашковіч // Кобрынскі веснік. - 2019. — 18 снежня (№ 98). — С. 4 : фот.

Аб творчай працы калектыву Астроміцкай школы.

**Грышкевіч, С**. Фітнес для педагогаў / Сяргей Грышкевіч // Настаўніцкая газета. - 2018. — 6 студзеня. — С. 7.

Адзін з асноўных напрамкаў дзейнасці Астроміцкай сярэдняй школы — работа па захаванні фізічнага і псіхалагічнага здароўя вучняў.

**Грэчка, І.** Дарогамі памяці / Ігар Грэчка // Настаўніцкая газета. - 2018. — 19 мая. — С. 10.

Тэме спаленых вёсак Кобрыншчыны прысвечана работа вучаніцы Астроміцкай сярэдняй школы В. Аўсяйчук.

**Елізарава, Ж.** Настаўнікам кветкі і песні / Жанна Елізарава // Кобрынскі веснік. - 2018. - 10 кастр. - С. 4.

Узнагароджаны лепшыя прадстаўнікі сферы адукацыі Кобрыншчыны, у іх ліку настаўнік рускай мовы і літаратуры Астроміцкай СШ Ларыса Гурыш.

**Елізарава, Ж.** Яны дабіліся поспехаў / Жанна Елізарава // Кобрынскі веснік. - 2018. - 13 студзеня. - С. 4.

У межах рэспубліканскай акцыі «Нашы дзеці» атрымалі віншаванні пераможцы раённага этапа рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах, у іх ліку В. Радковіч з Астроміцкай школы.

**Пашкович, Л.** Деревянный городок для малышей / Людмила Пашкович // Кобрынскі веснік. - 2018. — 23 мая. — С. 3.

Остромичская средняя школа продолжает облагораживать свою территорию.

**Пашковіч, Л.** Свята шчаслівай жанчыны / Людміла Пашковіч // Кобрынскі веснік. - 2018. — 19 мая. — С. 3.

Дырэктар Астроміцкай сярэдняй школы Галіна Свянцецкая — чалавек справядлівы і адказны.

**Пашкович, Л.** Фестиваль музеев покорился Остромичам / Людмила Пашкович // Кобрынскі веснік. - 2018. — 4 красавіка. — С. 3.

Музей «Спадчына» Остромичской средней школы признан победителем фестиваля «Парад музеев учреждений образования Кобринского района».

**Поздравляем** победителей олимпиады! // Кобрынскі веснік. - 2018. – 20 студзеня. – С. 9.

Среди победителей республиканской олимпиады по учебным предметам – учащаяся Остромичской средней школы О. Радкович (биология).

**Бакун, Е.** Люблю свой край / Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2017. — 24 мая. — С. 8.

На областном краеведческом фестивале творчески представила свою работу юный экскурсовод, учащаяся Остромичской средней школы А. Абрамчук.

**Бялоў, Д.** Для будучых абаронцаў Айчыны / Дзмітрый Бялоў // Кобрынскі веснік. - 2017. — 22 красавіка. — С. 7.

На чарговай спартакіядзе па шматбор\`і сярод вучняў школ горада і раёна сярод пераможцаў – каманда Астроміцкай школы.

**Бялоў, Д.** ... I ажно трыццаць першакласнікаў / Дзмітрый Бялоў // Кобрынскі веснік. - 2017. - 6 верасня. — С. 3.

У Астроміцкую сярэднюю школу прыйшлі атрымліваць веды 30 першакласнікаў.

**Дубіна, Л**. Юныя творцы атрымалі ўзнагароды / Людміла Дубіна // Кобрынскі веснік. - 2017. — 7 чэрвеня. — С. 8.

Вучань 9 класа Астроміцкай сярэдняй школы А. Чмель — сярод пераможцаў абласных літаратурных конкурсаў на беларускай і рускай мовах.

**Пашкович, Л.** Во имя памяти ушедших ... / Людмила Пашкович // Кобрынскі веснік. - 2017. — 6 мая. — С. 14.

Ко дню Великой Победы учащиеся Остромичской средней школы приводят в порядок памятники воинам, павшим в годы Великой Отечественной войны.

**Пашкович, Л.** Лучшие школы района / Людмила Пашкович // Кобрынскі веснік. - 2017. — 8 лютага. — С. 4.

По итогам смотра-конкурса на лучшее учреждение образования за 2016 год среди учреждений образования сельской местности первого места удостоена Остромичская средняя школа.

**Пашкович, Л.** «Педагогический» велопоход / Людмила Пашкович // Кобрынскі веснік. - 2017. — 10 чэрвеня. — С. 4.

Коллектив работников Остромичской средней школы совершил велопоход по историческим местам.

**Без оглядки** в ледяную воду // Кобрин-информ. – 2016. – 21 апреля. – С. 2.

Ученик 9 класса Остромичской средней школы Егор Тарасенко спас 5-летнюю девочку, тонувшую в озере.

**Выратаваў** дзяўчынку // Народная трыбуна. - 2016. — 29 красавіка. — С. 3.

Вучань Астроміцкай сярэдняй школы Я. Тарасевіч выратаваў дзяўчынку, якая танула ў возеры.

**Дубіна, Л.** Мой род, мая сям'я / Людміла Дубіна // Кобрынскі веснік. - 2016. — 5 лістапада. — С. 4.

Па выніках раённага этапа рэспубліканскага конкурсу даследчых работ «Мой род, мая сям'я» сярод пераможцаў Астроміцкая СШ.

**Казакова, А.** Интеллектуальная элита района / Анна Казакова // Кобрин-информ. - 2016. — 24 марта. — С. 2.

Наталья Мошко из Остромичской средней школы - среди победителей республиканской олимпиады по учебным предметам.

**Кобринчане** - среди победителей // Кобрынскі веснік. - 2016. — 20 студзеня. — С. 2.

По итогам республиканской олимпиады по учебным предметам Н. Мошко, учащаяся Остромичской СШ, удостоена диплома I степени (по трудовому обучению).

**Ковальчук, Ф.** «Блестящие» из Остромичей / Федор Ковальчук // Заря. - 2016. - 14 января. - С. 3.

Администрация Остромичской средней школы Кобринского района позаботилась о безопасности учеников, закупив для них жилеты-фликеры.

**Литвинович, Е.** Готовь цветник зимой / Евгений Литвинович // Заря. - 2016. - 10 декабря. - С. 6.

По итогам областного смотра-конкурса «Прекрасней станет Брестчина моя» Остромичская СШ признана лучшей в двух номинациях.

**Пашкович, Л.** Краше территория — выше награда! / Людмила Пашкович // Кобрынскі веснік. - 2016. - 9 лістапада. - С. 7.

Остромичская средняя школа стала дипломантом первой степени областного смотра-конкурса по наведению порядка и озеленению школьных территорий.

**Пашкович, Л.** Остромичская «Гармония» / Людмила Пашкович // Кобрынскі веснік. - 2016. - 1 чэрвеня. - С. 8.

В Остромичской средней школе открыли тренажерную комнату.

**Пашкович, Л.** Чудеса на Рождество / Людмила Пашкович // Кобрынскі веснік. - 2016. - 20 студзеня. - С. 8.

Учащиеся Остромичской сельской школы участвовали в благотворительном марафоне «Спеши делать добро людям».

**Салей, О.** От теории - к практике / Оксана Салей // Кобрынскі веснік. - 2016. - 6 красавіка. - С. 6.

Учащиеся Остромичской школы начали изучать предмет «Химия» на повышенном уровне и посетили с экскурсией СООО «ПП Полесье».

**Тимошук, А.** Смелость не имеет возраста / Анна Тимошук // Кобрынскі веснік. - 2016. — 27 красавіка. — С. 4.

Ученик 9 класса Остромичской средней школы Егор Тарасенко спас тонущую 5-летнюю девочку.

**Школьны** двор як крыніца натхнення // Настаўніцкая газета. - 2016. - 13 снежня. - С. 5.

Другі год запар Астроміцкая СШ перамагае ў абласным аглядзе-конкурсе «Цудоўней стане Брэстчына мая».

**Бялоў, Д.** У чаканні першага званка / Дзмітрый Бялоў // Кобрынскі веснік. - 2015. - 22 жніўня. - С. 1, 2.

Астроміцкая сярэдняя школа напярэдадні новага навучальнага года.

**Ковальчук, Ф.** Воспитание красотой / Фёдор Ковальчук // Заря. - 2015. - 6 июня. - С. 5.

Территории школьного двора учреждения образования «Остромичская сельская школа» поражает воображение.

**Кондрашук, Н.** «Золотая» и «серебряная» молодежь / Наталья Кондрашук // Кобрин-информ. - 2015.— 18 июня. — С. 2.

Две золотые медали - таков итог 2014/2015 учебного года Остромичской средней школы.

**Лесік, І.** Аб выніках алімпіяд / Ірына Лесік ; фота Дзмітрыя Бялова // Кобрынскі веснік. - 2015. — 21 студзеня. — С.13.

Сярод прадстаўнікоў Кобрыншчыны, якія ўнесены ў спіс дыпламантаў III этапа рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах, навучэнцы Астроміцкай сярэдняй школы.

**Логвинович, Я.** Деревенские наступают / Яков Логвинович // Кобрин-информ. - 2015. — 15 октября — С. 5.

В чемпионате интеллектуальных игр среди школьников Кобринского района приняли участие команда «Крутые перцы» Остромичской СШ.

**Свянцецкая, Г.** Школьны двор - тэрыторыя радасці / Галіна Свянцецкая // Настаўніцкая газета. - 2015. - 23 чэрвеня. - С. 5.

Прыгажосць школьнай тэрыторыі Астроміцкай СШ дазваляе настроіцца на добры лад.

**Пашкович, Л.** Когда благоустройство зов души / Людмила Пашкович // Кобрынскі веснік. – 2015. – 6 чэрвеня. – С. 4.

Благоустроенная территория Остромичской школы не может не привлечь внимания.

**Пашкович, Л.** Остромичских школьников одели в жилеты-фликеры / Людмила Пашкович // Кобрынскі веснік. - 2015. - 9 снежня. - С. 5.

В Остромичской средней школе учащиеся начальных классов одели жилеты со светоотражающимися элементами.

**Пашковіч, Л.** У спадчыну – памяць / Людміла Пашковіч // Кобрынскі веснік. – 2015. – 2 ліпеня. – С. 3.

Плённа працуе гісторыка-краязнаўчы музей Астроміцкай СШ, вучні якога штогод у ліку пераможцаў конкурсу юных экскурсаводаў вобласці і рэспублікі.

**Ивченков, С. Н.** Юные инспектора движения - помощники ГАИ / С. Н. Ивченков // Кобрин-информ. - 2014. - 24 апреля. - С. 6.

На областном слете юных инспекторов дорожного движения Кобринщину представил отряд Остромичской средней школы.

**Аматары** музейнай справы // Настаўніцкая газета. - 2013.— 16 ліпеня.— С. 13.

На Кобрыншчыне вызначылі лепшых экскурсаводаў школьных музеяў, сярод якіх юныя экскурсаводы з Астроміцкай сярэдняй школы.

**Казакова, А.** Высокие результаты на областной олимпиаде / Анна Казакова // Кобрин-информ. - 2013. — 24 января. — С. 6.

Команда учащихся Кобринского района приняла участие в третьем этапе республиканской олимпиады по учебным предметам, среди них Анастасия Конопацкая (Остромичская СШ).

**Педагогі** сябруюць са спортам // Настаўніцкая газета. - 2013.— 1 жніўня. — С. 4.

Найбольшых вынікаў на XVIII раённай спартакіядзе работнікаў установў адукацыі дасягнула каманда Астро-міцкай сярэдняй школы.

**Данилова, Е.** О заочке и равноправии / Елена Данилова // Заря. - 2012. - 22 ноября. - С. 1, 7.

Вступительную кампанию прошлого года проана-лизировал директор Остромичской школы.

**Казакова, А**. Первые шаги в науку / Анна Казакова // Кобрин-информ. - 2012. - 22 марта. - С. 3.

Впервые в истории проведения научно-практических конференций  в секции иностранных языков первое место присвоено учащимся Остромичской СШ.

**Мельнік, Р.** Кабрынчане працавалі выдатна! / Раман Мельнік // Кобрынскі веснік. - 2012. - 18 студзеня. - С. 1.

Па выніках трэцяга этапу рэспубліканскай алімпіяды па працоўным навучанні пахвальным водзывам узна-гароджана Н. Канапацкая з Астроміцкай СШ.

**Мельнік, Р.** «Я спяваю»: фінальны акорд / Раман Мельнік // Кобрынскі веснік. - 2012. - 5 снежня. - С. 3.

Пад эгідай Астроміцкага цэнтра культуры і адпа-чынку і Астроміцкай сярэняй школы адбыўся заключны тур фестываля дзіцячай песні.

**Бялоў, Д**. За новымі ведамі - у новыя класы / Дзмітрый Бялоў // Кобрынскі веснік. - 2011. - 20 жніўня. – С. 2.

У Астроміцкай СШ завяршылася падрыхтоўка да новага навучальнага года, зроблены поўны капітальны рамонт у пяці класах.

**Веремеенко, С.** Кобринчане на большом педсовете / страницу подготовила Светлана Веремеенко // Кобрин-информ. – 2011. – 8 сентября. – С. 3.

Директор Остромичской СШ С. П. Лаврисюк принял участие в общенациональном педсовете с участием Президента страны А. Лукашенко.

**Грэчка, І.** Год краязнаўчых перамог / Ігар Грэчка // Настаўніцкая газета. - 2011. - 29 снежня. - С. 13.

Пераможцы конкурсу на лепшы летапіс населенага пункта ў намінацыі «Сельскія населеныя пункты» - пошукава-даследчая група Астроміцкай СШ (кіраўнік Т. Тунчык, У. Абрамчук).

**І фізікі**, і лірыкі // Народная трыбуна. - 2011. - 12 лютага. - С. 3.

Годна выступілі кабрынчане на трэцім этапе рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах, у іх ліку і вучань Астроміцкай школы В. Леўшыц.

**Районный** конкурс «Биологический марафон -2011» завершен // Кобрин-информ. - 2011. - 28 апреля. - С. 2.

Среди победителей конкурса – учащийся 8 класса Остромичской СШ Дмитрий Строчук (диплом II степени).

**Мельнік, Р.** У школе заўсёды шмат спраў / Раман Мельнік // Кобрынскі веснік. - 2009. – 11 сакавіка. – С. 4.

На чарговым пасяджэнні калегіі ўпраўлення адукацыі Кобрынскага райвыканкама Астроміцкая СШ як пераможца раённага конкурсу па добраўпарадкаванню і кветкаваму афармленню ўстановы за 2008 год узнагароджана грашовай прэміяй.

**Владимиров, Д.** Нам любые дороги дороги : за здаровы лад жыцця / Дмитрий Владимиров // Кобрынскі веснік. - 2008. - 30 ліпеня. - С. 4.

**Мельнік, Р.** Любімы ўрок – фізкультура / Раман Мельнік // Кобрынскі веснік. – 2008. – 3 снежня. – С. 5.

Пра настаўніка фікультуры Астроміцкай СШ А. Астапука.

**Пянко, А.** Стала школа светлее / Алексей Пянко // Кобрынскі веснік. – 2006. – 1 лістапада.

Выполнен большой объем работ по капитальному ремонту здания Остромичской школы, благоустройству ее территории.

**Гром, А.** Не ради славы и похвал / А. Гром // Кобрынскі веснік. – 2005. – 28 верасня. – С. 2.

При Остромичской средней школе создан отряд «Милосердие».

**Ігнацюк, В.** За новымі ведамі аб родным краі / Валянціна Ігнацюк // Кобрынскі веснік. – 2003. – 15 лістапада. – С. 7.

У абласным спаборніцтве на лепшы турыстычны паход лепшай стала Астроміцкая СШ.

**Хільчук, М.** І вабяць вочы матылі і горкі / Марыя Хільчук // Кобрынскі веснік. – 2003. – 2 ліпеня. – С. 3.

Змянілася тэрыторыя каля Астроміцкай сярэдняй школы.

**Які** настаўнік, такі і вучань! // Кобрынскі веснік. – 2002. – 13 сакавіка. – С. 3.

Пра пераможцаў раённай алімпіяды Астроміцкай сярэдняй школы.

**Константинов, А**. Славится школа традициями / Алексей Константинов // Заря. – 2001. – 6 октября.

Об учителе биологии Остромичской СШ Людмиле Сергеевне Кривчене.

**Бараноўская, Л.** У добры час, юныя таленты! / Л. Бараноўская // Кобрынскі веснік. – 1998. – 6 мая.

У раённым фестывале юных талентаў прымалі ўдзел вучні Астроміцкай школы.

**Бараноўская, Л.** Моладзь хоча ведаць усё / Л. Бараноўская // Кобрынскі веснік. – 1997. – 13 снежня. – С. 2.

Адным з пераможцаў у першым чэмпіянаце інтэлектуальных каманд «Што? Дзе? Калі?» стала каманда «Моцны арэшак» Астроміцкай СШ (капітан Віталій Сідзюк).

**Міхальчук, У**. Конкурс педагагічнага майстэрства / У. Міхальчук // Кобрынскі веснік. – 1997. – 4 чэрвеня. – С. 3.

У фінал конкурсу педагагічнага майстэрства выйшлі сем самых эрудыраваных педагогаў-арганізатараў, сярод якіх Людміла Аляксееўна Самасюк (Астроміцкая СШ).

**Хільчук, М**. У новы навучальны год – з аптымізмам / Марыя Хільчук // Кобрынскі веснік. – 1996. – 31 жніўня. – С. 2.

Адрамантавана Астроміцкая сярэдняя школа.

**Хільчук, М.** Выбар / Марыя Хільчук // Кобрынскі веснік. – 1993. – 26 мая. – С. 3.

Пра маладога настаўніка пачатковых класаў Астроміцкай СШ А. В. Чырука.

**Канапацкая, Т.** Падарунак да свята / Т. Канапацкая // Камуністычная праца. – 1985. – 3 верасня.

У Астромічах – новы будынак школы на 320 месц.

# СПІС
# перыядычных выданняў, матэрыялы з якіх уключаны ў паказальнік

Вечерний Брест

Заря

Камуністычная праца

Кобрин-информ

Кобрынскі веснік

Народная трыбуна

Настаўніцкая газета

Советская Белоруссия

# ЗМЕСТ


| | | |
|---|---|---|
| | **Ад складальніка** | 3 |
| I. | Да вытокаў | 5 |
| II. | У творчым саюзе: сучасны дзень школы | 7 |
| III. | Школа міру – школа дабра | 12 |
| IV. | У спадчыну – памяць: гісторыка-краязнаўчы музей школы | 19 |
| V. | Школьны двор як крыніца натхнення | 26 |
| | **Спіс крыніц** | 31 |
| | **Спіс** перыядычных выданняў, матэрыялы з якіх уключаны ў паказальнік | 46 |

# ПЕРШАЯ «ШКОЛА МІРУ» НА БРЭСТЧЫНЕ

***Да 110-годдзя з часу першага згадвання аб школе ў в. Астромічы Кобрынскага раёна***
***(дзяржаўная ўстанова адукацыі «Астроміцкая сярэдняя школа»)***

**Інфармацыйна-бібліяграфічнае выданне**


Складальнік
Курачук Святлана Дзмітрыеўна

Камп’ютарная вёрстка С. Д. Курачук
Дызайн вокладкі П. С. Грыневіча

На беларускай, рускай мовах

Надрукавана на камп’ютарна-выдавецкай сістэме Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі



Вул. Маршала Жукава, 12, 225306, г. Кобрын
Цэнтральная раённая бібліятэка
E-mail kobrinlib@gmail.com
www.krcls.by